Канцэвіч А.М., студ. гр. 519а ФММ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Ражкова Л.Л.,
канд. пед. навук, дацэнт

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ УМОВЫ ФАРМАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ САМААЦЭНКІ СПЕЦЫАЛІСТА У ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ ВНУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія гады ў тэорыі і практыцы вышэйшай адукацыі назіраецца супярэчнасць паміж арганізацыей сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў і новымі патрабаваннямі да іх кваліфікацыі, асобаснаму статусу і прафесійнай сталасці. Дадзеная супярэчнасць спарадзіла шэраг узаемазлучаных паміж сабой праблем, якія абагульнёным выглядзе можна пазначыць як неадпаведнасць традыцыйнай педагогікі вышэйшых навучальных установ тым псіхалагічным заканамернасцям, па якіх у рэчаіснасці і ажыццяўляецца прафесійнае станаўленне асобы. Рашэнне дадзенай праблемы вышэйшай прафесійнай адукацыі, перш за ўсё, прадугледжвае яе ўсебаковае навуковае асэнсаванне, скіраванае на пошук педагагічных і псіхалагічных механізмаў паспяховай вучэбна-прафесійнай дзейнасці.

У цэнтры ўвагі нашага даследавання станаўленне студэнта як будучага спецыяліста. Узроставы перыяд студэнцтва – гэта ў асноўным юнацкі узрост. Адбываюцца змены падрастаючай асобы ў адносінах да вучэння, да самога сябе, да навакольнай рэчаіснасці. Значнасць гэтых змен для дадзенай асобы павялічваецца. Змяняюцца запатрабаванні, інтэрасы, перакананні чалавека, змяняюцца яго погляды і адносіны да ўсяго навакольнага і да самога сябе. У юнацкім узросту канчаткова адбываецца фізічнае фарміраванне. Адбываецца пераход ад вонкавага кіравання да самакіравання, а для гэтага неабходна інфармацыя, якую юнак пачынае шукаць ужо у сваім унутраным свеце. Юнацкі ўзрост – гэта перыяд інтэнсіўнага развіцця і ўзбагачэння светапогляду. У дадзены перыяд рэзка ўзрастае цікавасць да тэарэтычных

ведаў, жаданне усталяваць агульныя прынцыпы і заканамернасці. Такое становішча падрыхтавана ўсім ходам папярэдняга псіхалагічнага развіцця, і першым чынам развіццём самасвядомасці.

Найбольш спрыяльнай для фарміравання будучага спецыяліста з'яўляецца адэкватны яе узровень, які прадугледжвае роўнае прызнанне чалавекам як сваіх вартасцяў, так і недахопаў. У аснове аптымальнай самаацэнкі, якая выяўляецца праз станоўчую ўласцівасць асобы - упэўненасць, знаходзіцца неабходны досвед і адпавядаючыя веды. Упэўненасць у сабе дазваляе чалавеку рэгуляваць узровень дамаганняў і правільна ацэньваць уласныя магчымасці ў дачыненні да розных прафесійных і жыццёвых здарэнняў. Упэўнены чалавек крытычна ставіцца да дапушчаных памылак, аналізуючы іх чыннікі, з тым, каб не паўтарыць іх ізноў. Трэба імкнуцца развіваць у сябе адэкватную самаацэнку. Спазнаўшы і ацаніўшы сябе, чалавек можа больш свядома, а не стыхійна кіраваць сваімі паводзінамі і займацца самавыхаваннем.

Прафесійная самаацэнка мае важнае значэнне ў прафесійнай дзейнасці, і менавіта на этапе прафесійнага станаўлення, калі адбываецца ўваходжанне ў сістэму міжасобасных зносін у вызначанай прафесійнай супольнасці. Яна непарыўна звязана з механізмамі прафесійнай паспяховасці, з рашэннем праблем кампетэнтнасці, фарміраваннем цэласнай выявы сябе як прафесіянала.

Важнай часткай развіцця прафесійных кампетэнцый будучага спецыяліста з'яўляюцца педагагічныя ўмовы. Педагог стварае адпаведныя умовы, якія спрыяльна ўплываюць на станаўленне прафесійнай самаацэнкі. Важнасць і адказнасць педагога за гэты працэс бясспрэчны, таму педагог абавязаны выкарыстоўваць шырокі спектр метадычных прыемаў і метадаў для уплыву на прафесійнае развіццё студэнта: ад арганізацыі вучэбна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхаваўчага працэсу да стварэння магчымасцяў прафесійнай і творчай рэалізацыі студэнтаў пры дапамозе канцэртнай дзейнасці.

Мы праводзілі даследаванне па фарміраванню прафесійнай самаацэнкі студэнтаў кафедры беларускай народнапесеннай творчасці БДУКМ. У эксперыменце удзельнічалі 48 студэнтаў (эксперыментальны і кантрольны калектывы). Зыходзячы з удзелу ў прафесійнай дзейнасці, кожны калектыў, перад пачаткам даследавання дадзенай праблемы, быў падзелены на групы паспяховых і непаспяховых студэнтаў. Паспяховымі ў прафесійнай дзейнасці мы прызналі 24, і, адпаведна 24 прызнана непаспяховымі. Пры дапамозе методыцы даследавання самаацэнкі Дэмбо-Рубінштэйна і методыцы даследавання самаацэнкі асобы З.А. Будассі, намі быў праведзены канстатуючы эксперымент, які дазволіў вызначыць індывідуальныя асаблівасці прафесійнай самааценкі студэнтаў.

Эксперымент паказаў, што існуюць відавочныя праблемы ў прафесійнай самаацэнцы студэнтаў у кожнай з груп. У групе непаспяховых студэнтаў назіраліся разрозненыя, дыскрытныя вынікі па кожным з паказчыкаў, у той час як у групе паспяховых студэнтаў назіраліся больш стабільныя даныя. У асоб з малым вопытам прафесійнай дзейнасці - нізкая прафесійная самаацэнка, таму папярэдні аналіз даў падставу спадзявацца на тое, што з ростам узроўня прафесійнай дзейнасці вырасце і самаацэнка. Такія вынікі сведчаць аб тым, што, чым больш сфарміравана прафесійная самасвядомасць і прафесійнае самавызначэнне, тым бліжэй узровень прафесійнай самаацэнкі да адэкватнага. Узнікае неабходнасць карэкцыі прафесійнай самаацэнкі нашых студэнтаў пры дапамозе спецыяльных педагагічных умоў, таму што менавіта яны з'яўляюцца значным фактарам развіцця прафесійных якасцяў.

Назіранні за кантрольным і эксперыментальным калектывамі дазволілі нам выявіць шляхі ўдасканалення развіцця прафесійнай самаацэнкі. Да іх мы адносім:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Мае рацыю шырако выкарыстоўваць славесныя метады навучання, у прыватнасці гутарку, для магчымасці больш поўнага ўсведамлення студэнтам абранай спецыяльнасці. (Прафесійная самасвядомасць прыводзіць да прафесійнага самавызначэння, што непасрэдна звязана з развіццём прафесійнай самаацэнкі.)
- Для фарміравання прафесійна важных якасцяў асобы, было б карысным правядзенне трэнінг-практыкума "Рыхтуюся да прафесійнай дзейнасці". Мэта дадзенага трэнінгу - стварэнне ўмоў прафесійнага развіцця. Чым раней адбываецца асобаснае і прафесійнае развіццё, тым хутчэй адбываецца прафесійнае станаўленне.
- Стварэнне аднолькавых умоў падчас падрыхтоўкі канцэртнай праграмы, пры якіх студэнты будуць мець магчымасць рэалізацыі творчых здольнасцей, усведамленне сябе важнай складаючай ўсяго творчага працэсу, пры ўмове пазітыўнага стаўлення адзін да аднаго.
- Стварэнне эксперыментальнай лабараторыі, як мадэлі будучай прафесійнай дзейнасці, умова самастойнай працы, ацэнкі сваіх прафесійных якасцяў пад кіраўніцтвам педагога.

Кантрольны эксперымент паказаў, што ў эксперыментальным калектыве адбыліся дадатныя зрухі паказчыкаў у параўнанні з кантрольным. Гэта сведчыць а тым, што выяўленыя намі педагагічныя ўмовы і шляхі ўдасканалення працэсу развіцця прафесійнай самаацэнкі здольны больш паспяхова фарміраваць прафесійныя кампетэнцыі студэнтаў і ўвогуле, прафесійную самаацэнку студэнтаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе ВНУ.

Літаратура:

1. Зеер Э.Ф. Психология профессионального образования: практикум: учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / Э.Ф. Зеер, А.М. Павлов. – М.: Издательский центр «Академия», 2008. – 138 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Кон И.С. Психология юношеского возраста: (Проблемы формирования личности): Учеб. пособие для студ. пед. ин-тов / И.С. Кон. – М.: Просвещение, 1979. – 175 с.

3. Рубинштейн С.Л. Основы общей психологии / С.Л. Рубинштейн: в 2 т. - Т. 2. М.: Прогресс, 1989. - 328 с.

Чеснокова И.И. Особенности развития самооценки в онтогенезе // Принцип развития в психологии / И.И. Чеснокова. - М., 1978. - 250 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ